ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г.
4 кастрычніка
ЧАЦВЕР
№ 27 (1253)
Цана 2 кап.

## НАВІНЫ БДУ

### Новае папаўненне

1925 студэнтаў-першакурснікаў уліліся ў прафсаюзную арганізацыю універсітэта.

Зараз у групах першакурснікаў праходзяць першыя прафсаюзныя сходы, на якіх члены прафбюро факультэтаў знаёмяць іх з Уставам прафесіянальных саюзаў, дапамагаюць выбраць прафактыў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі.

25 кастрычніка прафсаюзны камітэт універсітэта будзе трымаць справаздачу перад 10-тысячнай студэнцкай прафсаюзнай арганізацыяй за тры гады работы (1976—1979 г.г.).

### Тыдзень сяброўства

Тыдзень дружбы ў гонар 30-годдзя ўтварэння ГДР будзе праходзіць з 15 кастрычніка ў БДУ імя У. І. Леніна.

У праграме — сустрэчы членаў Саюза свабоднай нямецкай моладзі з актывам камсамола ВНУ, сустрэчы з лаўрэатамі прэміі Ленінскага камсамола, семінары з замежнымі студэнтамі «100 пытанняў аб ГДР», вечар «Літаратура і паэзія ГДР», сустрэчы па валейболу паміж савецкімі студэнтамі і студэнтамі ГДР, дыскатэка.

### Факультэт грамадскіх прафесій

Зноў пачаў работу факультэт грамадскіх прафесій. У гэтым годзе адкрываецца 8 аддзяленняў. Акрамя ранейшых: лектарска - прапагандысцкага, харэаграфічнага, фотакарэспандэнтаў, мастакоў-афарміцеляў, мастацкага слова, суддзяў і грамадскіх інструктараў, кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў, у гэтым годзе створана яшчэ аддзяленне бальнага танца.

### Мацнеюць сувязі

Цесная сувязь існуе паміж БДУ і універсітэтамі многіх сацыялістычных краін. Нядаўна з практыкі ў Балгарскай Народнай Рэспубліцы вярнулася група студэнтаў геаграфічнага факультэта на чале з кіраўнікамі: кандыдатамі геаграфічных навук М. В. Лаўрыновічам і І. П. Галай. Шмат цікавага расказалі аб Балгарыі выкладчык геаграфічнага факультэта універсітэта імя К. Ахрыдскага прафесар Мілан Георгіеў, студэнты факультэта. У сваю чаргу прадстаўнікі Беларусі расказалі сябрам аб БДУ, сваім факультэце. Практыка прайшла на «выдатна».

## 7 КАСТРЫЧНІКА — ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР




Перавагі сацыялістычнага ладу ў забеспячэнні правоў чалавека можна паказаць на прыкладзе кожнага артыкула Канстытуцыі Савецкай дзяржавы. Наша моладзь валодае ўсёй паўнатой правоў і свабод, якія прадастаўляюцца савецкім грамадзянам Канстытуцыяй і законамі СССР.

На гэтым здымку вы бачыце студэнта фізічнага факультэта Сяргея **Жардзецкага.** Ён праходзіць педагагічную практыку ў школе. Вось яно — яскравае ўвасабленне правоў моладзі на працу і адукацыю.

**(Чытайце на 3-й старонцы).**

**Новы навучальны год уступіў у свае правы. Каля 18 тысяч студэнтаў пачалі зноў займацца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Сярод іх першы раз у аўдыторыю зайшлі тыя, хто паступіў вучыцца ў гэтым годзе. Другога кастрычніка адбыўся Савет універсітэта, які абмеркаваў вынікі прыёму студэнтаў на першыя курсы ў 1979 годзе і задачах па арганізацыі набора студэнтаў у 1980 годзе. Пасля пасяджэння наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў адказнага сакратара прыёмнай камісіі Р. А. Жмайдзяка.**

ПРЫЁМ У БДУ: ПРАБЛЕМА ЯКАСЦІ

# АД АБІТУРЫЕНТА—ДА СТУДЭНТА

**— Расціслаў Афанасьевіч, у сваім дакладзе вы называлі шэраг лічбаў, аперыравалі шматлікімі фактамі. Ці не маглі б вы астанавіцца на тых праблемах, якія ўзнікаюць пры наборы студэнтаў на першыя курсы. Як праходзіць набор і якая пры гэтым праводзіцца работа?**

— Відаць, не ўсім вядома работа па прыёму патоку студэнтаў на новы навучальны год. Хачу сказаць, што справа гэта вельмі адказная і карпатлівая. Яна патрабуе шмат энергіі, умення ўбачыць у сённяшнім абітурыенце заўтрашняга студэнта, па-сапраўднаму падрыхтаванага да вучобы ў вышэйшай навучальнай установе. Вядома, арганізацыя правядзення прыёму строга рэгламентуецца Правіламі прыёму і Інструкцыйнымі пісьмамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР. Адпаведна з гэтым дакументам загадам па універсітэту была створана прыёмная камісія на 1979 год.

У склад камісіі пад старшынствам рэктара універсітэта акадэміка АН БССР У. А. Белага былі ўключаны прарэктары, дэканы факультэтаў, вядомыя вучоныя, прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ, райкома партыі, райкома камсамола, абкома прафсаюзаў, парткома, мясцкома, камітэта камсамола, прафсаюзнай арганізацыі. Быў зацверджаны сакратарыят прыёмнай камісіі. Увесь штат прыёмнай камісіі склаў: 16 чалавек сакратарыята, 45 тэхнічнага персаналу і 140 выкладчыкаў — членаў экзаменацыйнай камісіі, у склад якой увайшлі 3 прафесары, 62 дацэнты і кандыдаты навук.

**—Адказам на гэта пытанне, відаць, будзе ўвесь ваш далейшы расказ. А зараз, што галоўнае, накіроўваючае можна адзначыць у плане мерапрыемстваў, якія былі распрацаваны прыёмнай камісіяй?**

— Галоўная ўвага ў планах, як ва універсітэцкім, так і факультэцкіх, была ўдзелена прафесіянальнай арыентацыі абітурыентаў, тлумачальнай рабоце сярод моладзі прадпрыемстваў, у калгасах, саўгасах, ва ўстановах і воінскіх падраздзяленнях. З гэтай мэтай была праведзена работа па набору слухачоў на падрыхтоўчае аддзяленне з ліку рабочых, калгаснікаў і дэмабілізаваных з радоў Савецкай Арміі. Адпаведна з планам для аказання дапамогі паступаючым ва універсітэце былі арганізаваны падрыхтоўчыя курсы: дзённыя, вячэрнія і завочныя. Для моладзі прамысловых прадпрыемстваў камітэт камсамола арганізаваў падрыхтоўчыя курсы на грамадскіх асновах, дзе заняткі праводзілі студэнты старэйшых курсаў. Важную справу ў арыентацыі адыгралі школы юных фізікаў, хімікаў, карэспандэнтаў, біёлагаў, географаў, матэматыкаў, праграмістаў, філолагаў, юрыстаў, гісторыкаў. У іх займаліся 557 вучняў старэйшых класаў школ горада Мінска. Асабліва хочацца адзначыць школу праграмістаў.

На падрыхтоўчым аддзяленні займаліся 307 слухачоў, 290 з іх залічаны на першыя курсы. На падрыхтоўчых курсах на ўсіх формах вучобы займаліся 3848 чалавек. У мінулым годзе — толькі 3006. 1183 падалі заяву на паступленне, што на 27 працэнтаў больш у параўнанні з мінулым годам. 95 працэнтаў выпускнікоў, якія займаліся ў школах пры факультэтах, падалі заявы, вытрымалі ўступныя экзамены і залічаны ва універсітэт.

**— Расціслаў Афанасьевіч, я хачу напомніць яшчэ адзін факт, які гаворыць пра аб'ём і эфектыўнасць работы, якая была праведзена ва універсітэце: з 1183 чалавек, якія падалі заявы на паступленне, пры сканчэнні падрыхтоўчых курсаў, кожны другі паспяхова здаў экзамены і зараз вучыцца на першым курсе па абранай спецыяльнасці. Відаць, гэта нямала, мяркуючы па тым, што ў мінулым годзе было залічана адпаведна 45 працэнтаў. Не менш цікава было б даведацца, як праходзілі ўступныя экзамены, што было зроблена для таго, каб найбольш аб'ектыўна і грунтоўна праверыць веды абітурыента.**

— Сапраўды, гэта вельмі складаная і адказная справа. Усе ўступныя экзамены праводзіліся ў строгай адпаведнасці з Правіламі прыёму і Палажэннем аб экзаменацыйных камісіях. Экзаменацыйныя заданні, напрыклад, для пісьмовых работ выдаваліся прарэктарам У. Р. Івашыным за 15 хвілін да экзаменаў. Канверты з тэмамі сачыненняў і заданнямі пісьмовых работ адкрываліся ў аўдыторыях адным са студэнтаў. Пісьмовыя работы шыфраваліся ў асобным пакоі і правяраліся ў дзень іх напісання. Вынікі экзаменаў кожны дзень уносіліся ў праграму машыны для статыстычнай апрацоўкі.

**— Нарэшце, экзамены здадзены, запоўнены адзнакамі карткі абітурыентаў і ў вас ёсць, напэўна, свае меркаванні наконт вынікаў, работы па прыёму судэнтаў. У чым выявіліся прабелы ў ведах абітурыентаў?**

— Ёсць, зразумела. Іх шмат, але хацелася б звярнуць увагу на некаторыя. Не ўсе, вядома, здалі ўступныя экзамены на «выдатна» і «добра», а гэта значыць, што веды па тых або іншых прадметах у абітурыентаў няроўныя. Асабліва цяжкімі для ўсіх былі пісьмовыя заданні. Найбольшая колькасць

**(Працяг на 2-й стар.).**

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

абітурыентаў атрымала нездавальняючыя адзнакі іменна на пісьмовых экзаменах. Так, напрыклад, па матэматыцы з 1132 работ 179 «нездавальняючых». Калі гаварыць пра вусныя экзамены, дык слабыя веды былі выяўлены пры здачы такіх прадметаў, як гісторыя СССР, біялогія, руская мова і літаратура. Не без увагі пры падліку балаў былі атэстаты абітурыентаў. Але хочацца сказаць, што толькі 41,1 працэнта іх пацвердзілі адзнакі атэстата.

З 816 медалістаў пацвердзілі медаль 554 чалавекі. Вытрымалі экзамены і прыняты на вучобу 574 медалісты. Конкурс сярод школьнікаў склаў 4 чалавекі на месца. Конкурс на прыродазнаўчыя факультэты павялічыўся з 1,38 у 1978 годзе да 1,8 у 1979 годзе. Конкурс па БДУ-2,57, а ВНУ горада Мінска—2,4.

З лічбаў відаць, што колькасць заяў ва універсітэт у гэтым годзе параўнальна з мінулым годам значна ўзрасла.

# Ад абітурыента—да студэнта

**— Магчыма, зараз можна зрабіць параўнанне вынікаў прыёму абітурыентаў у 1978—1979 гадах, або, напрыклад, за некалькі апошніх гадоў.**

— Вы маеце рацыю. Сапраўды, па сканчэнню ўступных экзаменаў прыёмная камісія правяла аналіз вынікаў не толькі ў параўнанні з 1978 годам, але і за апошнія 9 гадоў. План прыёму з 1970 года практычна не змяніўся і складае ў цэлым па універсітэту у сярэднім 3000 чалавек, у тым ліку на дзённай форме вучобы 2000, а па вячэрняму і завочнаму па 500 чалавек. Тым не менш, у параўнанні з мінулым годам план зменшыўся на 125 чалавек. Агульны конкурс паступаючых павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам з 1,93 да 2,27 чалавека на месца, але гэта на 0,5 ніжэй, чым у 1970 годзе. Упершыню з 1972 года конкурс на дзённую форму вучобы пачаў расці. Хочацца адзначыць і тое, што па ўсіх факультэтах і ўсіх формах вучобы конкурс у гэтым годзе павялічыўся ў параўнанні з 1978 годам. Нельга прапусціць і той факт, што конкурс на прыродазнаўчыя факультэты ўзрос у параўнанні з гуманітарнымі.

У агульным па БДУ на дзённую форму навучання было пададзена 4219 заяў. Вытрымалі экзамены 3127 чалавек, што складае 75,3 працэнта. Толькі ў 15% абітурыентаў сярэдні бал атэстата быў ніжэй 4,5. На «выдатна» здалі 615 чалавек, на «выдатна» і «добра» — 913, на «нездавальняюча»—778 чалавек.

Для прыцягнення моладзі ва універсітэт прыёмнай камісіяй была праведзена вялікая работа ў гэтым напрамку. Аб універсітэце і прыёме абітурыентаў у перыядычным друку змешчана 176 публікацый, праведзена 9 радыё- і 6 тэлеперадач. Выкладчыкамі універсітэта для абітурыентаў падрыхтаваны і праведзены па тэлебачанню 42 вучэбныя перадачы па фізіцы, матэматыцы, біялогіі, гісторыі, хіміі і беларускай мове. Выпушчаны спецыяльны навукова-папулярны фільм «Запрашае універсітэт», зняты сюжэты з жыцця універсітэта для кінажурналаў «Савецкая Беларусь» і «Тэхніка моладзі». Выдадзены універсітэцкі і факультэцкія буклеты, брашуры аб універсітэце, агульнауніверсітэцкі і факультэцкія плакаты-аб'явы, выпушчаны два спецыяльныя нумары газеты «Беларускі універсітэт», правілы прыёму ва універсітэт і разасланы ва ўсе абласныя, гарадскія і раённыя аддзелы народнай адукацыі, райваенкаматы, сярэднія школы, дамы культуры і другія арганізацыі і ўстановы.

Новы навучальны год пачаўся, але ўжо цяпер, я лічу, патрэбна рыхтавацца да прыёму абітурыентаў у 1980 годзе. У гэтым павінны прыняць удзел усе супрацоўнікі і студэнты, усебакова рэкламаваць універсітэт, выкарыстоўваючы ўсе сродкі масавай інфармацыі: газеты, радыё, тэлебачанне.

Вось, здаецца, і ўсё, хацелася б праз газету пажадаць поспехаў у вучобе ўсім першакурснікам.

**Інтэрв'ю правёў У. БЕЛЬСКІ.**

ПАЛІТЫЧНАЯ ВУЧОБА

# Па мэтавай накіраванасці

**1 кастрычніка пачаўся новы навучальны год у сістэме палітычнай вучобы. Аб формах замацавання ведаў, якія садзейнічаюць больш глыбокаму засваенню слухачамі праграмнага матэрыялу, аб планах на новы навучальны год ішла гутарка на партыйным сходзе вылічальнага цэнтра нашага універсітэта.**

Новы навучальны год у сістэме палітычнай вучобы знамянальны тым, што ён будзе праходзіць на завяршальным этапе дзесятай пяцігодкі, у час падрыхтоўкі да 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

Выконваючы рашэнні XXV з'езда партыі і далейшыя рашэнні ЦК КПСС, партыйная арганізацыя вылічальнага цэнтра многа ўвагі ўдзяляла палітычным ведам супрацоўнікаў. Былі арганізаваны тры тэарэтычныя семінары вышэйшага звяна палітычных ведаў і школа асноў марксізму-ленінізму (сярэдняга звяна), у якіх займалася больш чым 170 супрацоўнікаў, 125 з іх у вышэйшым звяне.

Вучоба праходзіла ў поўнай адпаведнасці з планамі, якія былі распрацаваны і зацверджаны на ўвесь навучальны год для кожнага семінара і школы. Своечасова даводзіліся планы чарговых заняткаў семінараў, прапаноўвалася літаратура для падрыхтоўкі да іх. І ўсёй гэтай клапатлівай працай займаўся адзін са старэйшых камуністаў універсітэта Трафім Афанасьевіч Воднеў. (Нядаўна ён адзначыў 40-годдзе знаходжання ў радах КПСС). Трафім Афанасьевіч змог так паставіць справу, што не было прапушчана ніводнага часу практычных заняткаў без уважлівых прычын.

Кіраўнікі семінараў, як правіла, рабілі абгрунтаваныя абагульненні і вывады, ставілі на абмеркаванне праблемныя пытанні, па якіх разгортваліся ажыўленыя дыскусіі. У навучальны працэс тэарэтычных семінараў, а таксама школы асноў марксізму-ленінізму трывала ўвайшла падрыхтоўка і абарона слухачамі рэфератаў, што значна павысіла ролю прапагандыста як кансультанта пры выбары тэмы, падборы літаратуры. Так, напрыклад, добрыя ўражанні пакінулі выступленні А. В. Зайчанкі, А. А. Захарэнкі, Я. Ф. Кавалевіч, Э. В. Кеды і многіх іншых.

Заняткі ў новым навучальным годзе пачнуцца з вывучэння тэмы «Ленінізм — рэвалюцыйны сцяг нашай эпохі». Задача гэтых заняткаў — яшчэ раз паказаць велічнасць Леніна — чалавека, правадыра, геніяльнага прадаўжальніка вучэння і справы К. Маркса і Ф. Энгельса, вялікага стратэга пралетарскай рэвалюцыі.

Гаворка ідзе цяпер пра тое, што патрэбны не фармальныя веды, а веды, якія заахвочваюць да добрасумленнай творчай працы, актыўнай барацьбы за рэалізацыю ідэалаў будаўніка камунізму, за пераадоленне і ліквідаванне ўсяго таго, што перашкаджае ажыццяўленню нашых спраў.

Жыццё паказвае, што сёння плённа працаваць можа толькі той, хто не задавальняецца сваімі раней набытымі ведамі, а ідучы ў нагу з жыццём, пастаянна працуе над павышэннем ідэйна-палітычнага узроўню, умела спалучае практычную працу з грамадскай дзейнасцю.

У новую праграму семінара ўключаны даклады па актуальных пытаннях унутрыпалітычнага і міжнароднага жыцця, метадыцы партыйнай прапаганды.

Закончыцца навучальны год тэмай «Справа Леніна жыве і перамагае». Мэта гэтых заняткаў: прааналізаваць дзейнасць свайго калектыву па ўвасабленню ленінскіх ідэй і планаў ў жыццё. Неабходна стварыць усе мовы для таго, каб яшчэ больш шырэй прыцягнуць камуністаў, усіх працоўных да багацця ленінскіх ідэй, павысіць асабістую адказнасць слухачоў сістэмы партыйнай вучобы за якасць вучобы, за глыбіню атрыманых ведаў.

**В. ШАЎЧУК,**
**наш спец. кар.**



**Нядаўна ва універсітэце адбыўся сход, прысвечаны дню прапагандыста. Былі падведзены вынікі мінулага навучальнага года ў сістэме партыйнай адукацыі. Лепшыя прапагандысты былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі і адзначаны каштоўнымі падарункамі. Сярод іх С. С. Шушкевіч, А. Я. Супрун, У. А. Навіцкі, Т. Я. Адамовіч і многія іншыя.**

**Аб задачах на новы навучальны год расказала Л. М. Русакова.**

**НА ЗДЫМКУ: перад прысутнымі выступае другі сакратар Маскоўскага райкома партыі І. Ф. ВАШКЕВІЧ.**

Фота **М. Дубовіка.**

НАМ ПІШУЦЬ

# Змястоўная экскурсія

Самая цудоўная вясёлая пара года — лета. Новыя песні, новыя сустрэчы, новыя ўражанні — гэта таксама лета. Я хачу расказаць аб тым, як прайшло яно ў мяне. Мы з сябрамі шмат ездзілі па Савецкаму Саюзу: хацелася як мага больш убачыць. Пачалося наша захапляючае падарожжа ў сталіцы СССР. Масква здзівіла нас мноствам музеяў, архітэктурных помнікаў і ансамбляў, цудоўнымі плошчамі, галерэямі і выстаўкамі. Нам давялося пабываць у Музеі імя А. С. Пушкіна, у Доме-музеі Ф. М. Дастаеўскага. Вялікае ўражанне выклікала ў нас наведванне кватэры, дзе жыў У. І. Ленін.

Надоўга застануцца ў памяці тыя вясёлыя прагулкі ў парку адпачынку імя М. Горкага, з яго прыгожымі зялёнымі алеямі і асвяжаючымі фантанамі.

Нам вельмі пашанцавала: мы прысутнічалі на адкрыцці і закрыцці летняй Спартакіяды народаў СССР, якая праходзіла на стадыёне імя У. І. Леніна.

З Масквы наш шлях ляжаў у Ленінград — калыску Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. І нас перш за ўсё цікавілі гістарычныя мясціны, якіх у горадзе вельмі шмат. Можна сказаць, Ленінград — гэта сама гісторыя рэвалюцыі. Мы пабывалі ля легендарнага крэйсера «Аўрора», тужлівай цішынёй сустрэлі нас Піскароўскія могілкі-мемарыял.

Летам у Ленінградзе вельмі прыгожа. Дзе яшчэ можна ўбачыць такія цудоўныя фантаны! Здзіўляе сваім хараством унікальны музей «Эрмітаж».

Вясёлымі ўсмешкамі, смехам, шумнымі пляжамі сустрэла нас Адэса.

Лета праляцела непрыкметна. Але надоўга застануцца ў нас успаміны аб цікавым падарожжы. Зараз у нас стала больш цікавых сяброў. А гэта галоўнае.

**Валато АМАР,**
**студэнт II курса журфака.**

# СПРАВЫ ЗЯМЛЯЦТВА

Кожны год у Савецкі Саюз прыязджаюць сотні маладых іарданцаў, каб атрымаць вышэйшую адукацыю ў ВНУ савецкай краіны. Яны вучацца ў інстытутах і універсітэтах розных гарадоў СССР. У Мінску займаецца больш як 50 студэнтаў з Іарданіі.

Іарданскае зямляцтва праводзіць вельмі вялікую работу для таго, каб студэнты мелі магчымасць добра вучыцца і адпачываць. Праводзяцца лекцыі, палітзаняткі, на якіх абмяркоўваюцца палітычныя падзеі ва ўсім свеце.

Нацыянальныя святы Іарданіі адзначаюцца пры актыўным удзеле ўсіх студэнтаў.

Рабяты арганізоўваюць вечары, канцэрты, на якіх знаёмяць гасцей з нацыянальным мастацтвам сваёй краіны.

У час летніх і зімніх канікулаў іарданскім студэнтам прадастаўляюцца пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, на турбазы.

У Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна створаны цудоўныя ўмовы для вучобы і адпачынку замежных студэнтаў.

**Маданат ХАСАН,**
**студэнт II курса журфака.**

СТУДЭНЦКІЯ АЛІМПІЯДЫ

# ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Вясной гэтага года ў Мінску на базе васьмі вышэйшых навучальных устаноў праводзіўся другі тур алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», прысвечаны XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване.

970 студэнтаў з 30 ВНУ рэспублікі прынялі ўдзел у гэтай алімпіядзе. Лідэрамі ў камандным заліку па асобных відах спаборніцтваў сталі 11 вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна — па беларускай і рускай літаратурах, па матэматыцы і фізіцы.

Па колькасці прызавых месц, якія заваяваны ў другім туры алімпіяды па розных відах спаборніцтваў, БДУ імя У. І. Леніна заняў першае месца ў рэспубліцы. 29 студэнтаў нашага універсітэта занялі прызавыя месцы. Адзінаццаць студэнтаў узнагароджаны Граматай ЦК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у размеры 50 рублёў.

9 студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна занялі другое месца і ўзнагароджаны дыпломам II ступені і грашовай прэміяй у размеры 35 рублёў і 9 студэнтаў, якія занялі трэцяе месца, узнагароджаны дыпломам III ступені і грашовай прэміяй у размеры 25 рублёў.

У 1979/80 навучальным годзе будзе праводзіцца алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Яна прысвячаецца 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Першы тур алімпіяды будзе праходзіць па наступных напрамках:

— прадметныя алімпіяды;

— конкурс па спецыяльнасці;

— агляд курсавых і дыпломных работ;

— агляд-конкурс вынікаў вытворчай практыкі.

Пераможцы прадметных алімпіяд аргкамітэтам універсітэта будуць рэкамендаваны для ўдзелу ў II Рэспубліканскім туры алімпіяды, прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

**І. СТУКАНАВА,**
**старшы лабарант вучэбна-метадычнага кабінета.**

# Ад «альфы» да «амегі»





(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Зусім нядаўна яны слухалі і канспектавалі лекцыі, цяпер — чытаюць і вядуць семінарскія заняткі самі. Іх аўдыторыя — вучні розных школ горада Мінска.

Вось адна з іх—№ 75. Школа як школа. Такія ж, як і ва універсітэце, званкі з урока і на ўрок.

Студэнты вучаць і вучацца самі. Вось у задуменні сядзіць студэнтка гістфака Лена Тоўсцікава: хутка на ўрок. На пытанне Аляксандра Кушніра адказваюць вучаніцы 10 «А» класа Ала Жарына і Эліна Рашчупкіна.

Студэнты не толькі праводзяць заняткі, але і выконваюць значную работу па пазакласнаму выхаванню школьнікаў. Вось і цяпер перад Сяргеем Жардзецкім стаіць сур'ёзная задача — як мага ясней і зразумела растлумачыць вучням асноўныя палажэнні новай Канстытуцыі СССР, другую гадавіну якой мы на днях будзем адзначаць. Хлопец загадзя рыхтаваўся да гэтага мерапрыемства і гутарка ўдалася.

Хто ведае, кім у будучым па прафесіі стануць гэтыя шасцікласнікі. Адно зразумела — яны павінны стаць сапраўднымі людзьмі.

У гэтую высакародную справу выхавання новага чалавека ўносяць сваю лепту і студэнты нашага універсітэта.

Фота і тэкст **М. Дубовіка.**



Г ДР сёння — адна з развітых краін свету. Другая сусветная вайна прынесла шмат пакут нямецкаму народу, разбурыла гарады, вывела са строю заводы і фабрыкі. Як узнялася рэспубліка з руін, адбудавала сваю гаспадарку?

Аднаўляць прамысловасць было цяжка, бо прыходзілася пачынаць амаль усё з нуля. Тым больш, што на захадзе хутка пасля вайны правыя сілы пачалі весці палітыку расколу. Вынікам гэтага стала стварэнне летам 1949 года Федэратыўнай Рэспублікі Германіі.



# Курсам міру і сацыялізму

**ДА 30-ГОДДЗЯ АБВЯШЧЭННЯ ГДР**

Адказам усіх дэмакратычных сіл усходу Германіі было рашэнне: абапіраючыся на актыўную дапамогу Савецкага Саюза, стварыць 7 кастрычніка 1949 года новую дзяржаву — ГДР, першую рабоча-сялянскую рэспубліку на нямецкай зямлі. Зразумела, першыя гады былі цяжкімі. «Пракокі» з заходу не прызналі нашу дзяржаву, прадказвалі ёй хуткі канец. Але нягледзячы на іх імкненні, ГДР не перастала існаваць, наадварот, яна вырасла і стала мацней. «Прарокі» недаацэньвалі сілу сацыялізму, брацкую дапамогу, якую наш народ атрымаў ад усіх сацыялістычных краін.

Нашы поспехі — вынік дзейнасці ўсяго народа. Рука аб руку ішлі рабочы клас, інтэлігенцыя і сялянства. Гэта яны стварылі прадпасылкі развіцця, вынікі якога зараз перад намі. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыграла наша Сацыялістычная Адзіная Партыя Германіі, аб'яднанне якой адбылося ў красавіку 1946 года. Яна і сёння вызначае палітыку нашай дзяржавы.

Што такое сучасная ГДР — усе ведаюць з артыкулаў у газетах, часопісах, з перадач тэлебачання і радыё. Вядома, што больш як 100 краін свету прызналі ГДР сёння, рэспубліка з'яўляецца членам ААН.

**Беатрыс ЭПЛЕР,**
**студэнтка III курса**
**аддзялення палітэканоміі.**

● **САЮЗ НАВУКІ З ВЫТВОРЧАСЦЮ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ**

# *Грані супрацоўніцтва*

**НАШ КРУГЛЫ СТОЛ**

*«Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна разам з вытворчым аб'яднаннем «Інтэграл» паспяхова ажыццяўляе план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне электроннай тэхнікі».*

*(З даклада П. М. Машэрава на XIX Пленуме ЦК КПБ).*

Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс. Гэтыя паняцці ўзаемазвязаны цесна. Найбольш спрыяльныя ўмовы для гэтага ствараюць аб'яднанні па тыпу «ВНУ — прадпрыемства». Па ініцыятыве рэдакцыі «Беларускі універсітэт» адбылася размова за «круглым сталом» аб праблемах і вопыце вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання, дзе навука прадпрыемства і ВНУ дзейнічаюць у адным страі. У размове прымаюць удзел дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна А. А. Лабуда, дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі С. Р. Мулярчык, студэнты А. Дворнікаў, А. Усталаў і У. Страленка.

**Карэспандэнт:** — Як вядома, дагавор аб супрацоўніцтве паміж універсітэтам і ВА «Інтэграл» падпісаны ў 1972 годзе, але творчыя і навуковыя сувязі ўстанавіліся ўжо даўно. Як вы лічыце, на што накіравана стварэнне гэтага вучэбна-навуковага аб'яднання?

**А. А. Лабуда:** — Партыя і ўрад увесь час праяўляюць клопат аб паляпшэнні падрыхтоўкі маладых спецыялістаў у сістэме вышэйшых навучальных устаноў. Аб гэтым гаворыцца і ў апошняй Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».

Адным са шляхоў вырашэння гэтай праблемы, на нашу думку, з'яўляецца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў для прадпрыемстваў пэўнай галіны з выкарыстаннем іх матэрыяльнай базы і прыцягненнем высокакваліфікаваных спецыялістаў да вучэбнага працэсу. Па гэтаму шляху ідзе факультэт радыёфізікі і электронікі. Так, па заданню Прэзідыума АН БССР пачата падрыхтоўка спецыялістаў па аўтаматызацыі навуковых даследаванняў, заключаны дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў для некаторых прадпрыемстваў рэспублікі.

Аднак, найбольшы вопыт у мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў наладжаны ў садружнасці з ВА «Інтэграл». У адпаведнасці з «Палажэннем аб навукова - вучэбна-вытворчым аб'яднанні Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна — ВА «Інтэграл» факультэт радыёфізікі і электронікі рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў. Сумесна з прадстаўнікамі аб'яднання праводзіцца адбор студэнтаў для спецыялізацыі па вызначанаму профілю. Вядучыя спецыялісты ВА «Інтэграл» прымаюць удзел у абмеркаванні праграм спецкурсаў і спецсемінараў, актыўна ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, чытаюць лекцыйныя курсы. Непасрэдна на прадпрыемстве студэнты выконваюць цыкл лабараторных работ, праходзяць вытворчую практыку, па тэматыцы прадпрыемства выконваюць курсавыя і дыпломныя работы.

**С. Р. Мулярчык:**—Стварэнне гэтага вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання накіравана, вядома, не толькі на тое, каб скарацiць тэрмін адаптацыі маладога спецыяліста, але і адабраць з усіх жадаючых займацца навуковай работай тых, хто ў ёй найбольш перспектыўны. Гэта, па-першае.

Па-другое, на тое, каб больш цесна звязаць вучэбны працэс з практыкай і навуковай дзейнасцю. Зараз, напрыклад, вядзецца работа па стварэнню базавай кафедры, якая будзе з'яўляцца вучэбным падраздзяленнем БДУ на прадпрыемстве.

**А. Дворнікаў:** — А зараз, пакуль што, гэту спецыяльнасць курыруе кафедра радыёфізікі і фізічнай электронікі. Група студэнтаў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры РТ і ФЭ А. Д. Андрэева выконвала гасдагаворную работу па распрацоўцы камплектаў некаторых прылад. Вынікі гэтай работы будуць выкарыстаны непасрэдна на вытворчасці, а ў наступным годзе яе прадоўжаць студэнты малодшых курсаў. Гэта работа дапаможа ім яшчэ больш блізкай пазнаць сваю будучую спецыяльнасць і авалодаць навыкамі, неабходнымі інжынеру-даследчыку.

**Карэспандэнт:** — Калі ласка, некалькі слоў аб прахожданні вытворчай практыкі ў аб'яднанні.

**А. Дворнікаў:** — Пасля III курса, у 1977 годзе, наша група факультэта радыёфізікі і электронікі была запрошана на ВА «Інтэграл» для напісання курсавых работ і азнаямленчай практыкі. Кожны студэнт быў замацаваны да навуковага кіраўніка ці да вядучага інжынера-тэхнолага з багатым вытворчым вопытам, якія аднеслі-ся да нас з павагай. Пазнаёмілі з сучаснымі дасягненнямі ў галіне электронікі і праблемамі, якія стаяць перад прадпрыемствам. Мы выбралі тэмы работ, якія нам прапанавалі ў аб'яднанні. Многія з нас дасягнулі значных поспехаў. Лепшыя работы дакладваліся на студэнцкіх навуковых канферэнцыях.

**А. Усталаў:** — На наступны год нам была прадастаўлена магчымасць працягваць пачатую работу. Дзякуючы тэарэтычным ведам і практычным навыкам, мы змаглі яшчэ больш углыбіцца ў распрацоўку і даследаванне праблем, якія нас цікавілі, звязаць іх з вытворчасцю.

Два гады працы на «Інтэграле» дапамаглі нам пашырыць навукова-тэхнічны кругагляд, навучыцца самастойна працаваць і ставіць перад сабой канкрэтныя задачы, усвядоміць патрабаванні, якія прад'яўляе прадпрыемства да маладых спецыялістаў.

**У. Страленка:**—У гэтым годзе ВА «Інтэграл» удзяляе нам асаблівую ўвагу. Лепшыя спецыялісты прадпрыемства Ю. І. Савоцін і А. І. Сухапараў чытаюць нам шэраг спецкурсаў. Але, хацелася б, каб гэтыя курсы чыталіся раней, напрыклад, на III курсе, калі мы толькі пачынаем знаёміцца з работай аб'яднання.

**А. А. Лабуда:** — Як ужо гаварылі рабяты, тэматыка дыпломных работ студэнтаў заўсёды ўзыходзіць у тэматыку ці вытворчы план аб'яднання. І таму яны амаль усе знаходзяць прымяненне ў вытворчасці. За гэты час выкладчыкі і студэнты ўкаранілі шмат навукова-даследчых работ са значным эканамічным эфектам. Навуковая работа студэнтаў уключае даследаванні, распрацоўкі новых тэхналогій.

**Карэспандэнт:** — На ваш погляд, вучэбны працэс адстае ад развіцця вытворчасці, ці не?

**С. Р. Мулярчык:** — Я лічу, што не адстае. Студэнты атрымліваюць веды ў вобласці электронікі, як гаворыцца, самыя «свежыя». Курс ім чытаюць вучоныя, спецыялісты, у аснове лекцый якіх ляжаць навуковыя даследаванні, распрацоўкі, толькі што ўкаранёныя ў вытворчасць. І таму, я думаю, што вучэбны працэс ідзе ў нагу з развіццём вытворчасці.

**Карэспандэнт:** — Ці ставіце вы мэту выхоўваць спецыялістаў толькі для гэтага прадпрыемства?

**А. А. Лабуда:** — У першую чаргу мы рыхтуем спецыялістаў для ВА «Інтэграл», але не толькі для яго. Ды гэта і немагчыма. Такія спецыялісты патрэбны і іншым прадпрыемствам электроннай прамысловасці, розным канструктарскім бюро і інстытутам.

Але дзе б рабяты ні працавалі, усюды яны прыносяць адчувальную карысць, усюды працуюць эфектыўна і якасна, а гэта значыць — працуюць не проста дысцыплінавана і прыкладна, а на сумленне, умела, рэзультатыўна, творча, працуюць прыгожа, так, каб і іншыя паважалі іх за працу, і каб самім было прыемна.

**Размову вяла Н. ЖУКАВА.**




Тры гады назад, у сувязі з узрастаючай смеханізацыяй, жартаманіяй і гумарашанавальнасцю сярод самых шырокіх слаёў студэнтаў і выкладчыкаў пры рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» была створана «кафедра агульнага смехаробства». Як паведамляе студэнцкая сацыялагічная лабараторыя, з таго часу колькасць смеху на душу універсітэцкага насельніцтва ўзрасла амаль у паўтара раза. Каб працэнт смеханізацыі быў большым, кіраўнік «кафедры», перспектыўны дацэнт Незалікін, звяртаецца да ўсіх чытачоў газеты з запрашэннем супрацоўнічаць і пісаць навуковыя работы менавіта на гэтай «кафедры». Прымаюцца ўсе жадаючыя без даведак і характарыстык, але з запасам гумару студэнцкага размаху.

А ў чарговы нумар нашай газеты выкладчыкі «кафедры» Канспектаў, Вадаліваў і Меркавальнікаў, а таксама лабарант Пісулькін разам са студэнтамі Шурай Шпорай, Гошай Паінькіным і Падказкіным даслалі матэрыялы, якія яны сабралі спецыяльна для першакурснікаў.

## ГАВОРАЦЬ АБІТУРЫЕНТЫ

Прататыпам вобраза Паўла Уласава паслужыў вобраз Паўла Карчагіна.

**Чацкі — разумны чалавек: гаворыць гучна.**

У працэсе эвалюцыі чалавек устаў на заднія ногі.

**Тры багатыры былі апрануты ў ваеннае абмундзіраванне.**

Вочы Бэлы былі падобны на каня Казбіча.

**Сэрца чалавека двухкамернае і таму днём працуе, а калі чалавек спіць — не працуе.**

Гаспадарку Плюшкін вёў бяспланава.

**Спачатку Нагульнаў хацеў застрэліцца, але потым знайшоў у сабе сілу волі і стаў вывучаць англійскую мову.**

Нягледзячы на тое, што цар Іван Грозны эксплуатаваў сялян, але ён іх вельмі любіў.

**У сярэднія стагоддзі дарогі былі такімі вузкімі, што на іх ледзь-ледзь раз'язджаліся два аўтамабілі.**

**Збіраў адказы лабарант Пісулькін.**

### НА ЗАМЕТКУ ПЕРВОКУРСНИКУ

Поступил в продажу интересный набор — «Юный студент». В изящной коробке находятся маленькие курсовые проектики, расчётики, зачётики. Из них можно сложить маленький дипломчик. Инструкция прилагается.

* * *

Еще вчера об обучении во сне говорили как о чуде. Сегодня этим уже никого не удивишь — целые аудитории спят на лекциях.

* * *

Утренней спешки можно избежать, если одеться и обуться с вечера. Если вы опоздаете в университет к началу занятий, помните: призыв «Учиться никогда не поздно» в деканате толкуют по-разному.




Без слоў.

# ЛІСТ З ДАРОГІ

«ДОБРЫ дзень, дарагія сябры! Мы з вамі ўжо даўно не бачыліся. Не ведаем, як вы нас прымеце ў гэты раз, але тое, што даўно мы з вамі сустракаліся, далібог праўда. Кожны раз хацеў напісаць да вас ліст, але ўсё не хапала часу. Ды не па маёй віне. Гэта ўсё мае сябры— Незалікін і Падказкін — зводзілі з розуму, —маўляў ім, значыць вам, і так не хапае часу, а то яшчэ нашы пісулі. А Пісулькін, я пра яго размову не хачу весці, то чарніла вып'е, то пасту з самапіскі высмакча і ўсё, каб улагодзіць вас, каб не сердавалі значыць. Дык я пішу малаком, можа і не прачытаеце, але калі пацерці гэтыя радкі якой-небудзь галавешкай, дык на паверхню ўсплыве гісторыя маіх чорных дзён, сумесна пражытых з імі. А малаком параіў пісаць мне Падказкін. Ён у гэтых справах мастак, хоць і самавучка. Я, кажа, дзе ўжо ні быў: і пад партай куёўчыўся, і каратаў гадзіны са сваім сябрам Шпорай у пачцы з-пад цыгарэт, і пралазіў у замочную дзірку, хоць з другога боку ключ быў устаўлены і шмат дзе яшчэ быў. Вопыту, хоць адбаўляй. Дык, кажа, гэты спосаб самы найлепшы. А вы ўжо мяне, відаць, пазналі. Вядома, так і ёсць. Я — Гоша, Гоша Паінькін, той самы, які некалі вёў з вамі размову.

У гэтым годзе мы прыехалі з будатрада. Мы свой атрад арганізавалі: я, Незалікін, Падказкін і Шпора. Гэта ўсё ініцыятыва Незалікіна. Яго мы і абралі камандзірам. Пачалі выбіраць назву атрада. Меркаванні былі розныміі: «Страла», «Грэнадзёр», нейкая «Эліта» ды яшчэ шмат іншых. Але тут наш камандзір як крыкне:

— Шабаш, як назаву, так і будзе.

— Во-во, — ажно падскочыў Падказкін.— «Шабаш», так і назавём. А раз нас шмат, значыць у множным ліку як будзе? — і павёў вачыма на Шпору, а той вазьмі і скажы: «Шабашнікі». Адпавядае назва ў дакладнасці і аператыўнасці нам. Асабліва, калі другія ў гэтым не цямняць. Так і назвалі. Ну і паехалі мы куды далей, на Поўнач. Прыехалі, туды-сюды, і... сталі будаваць лазню. «Выгадная справа, — кажа Незалікін, — грошай будзе — як у дурня махоркі». А тут яшчэ гэты навічок Вадаліваў, паддакнуў — і справе канец. Я вам не сказаў пра яго, пра Вадалівага. Узялі мы яго ў атрад па дарозе. Уцёк, кажа, з кафедры. Месяц водпуску, а потым можа якіх-небудзь даведак дастану і яшчэ на месяц застануся. Не ўпершыню, маўляў, раблю і падміргнуў мне. А мне—маргай не



маргай, з мяне, як з гуся вада, не дзяўчына—не пачырванею. Дык ён, Вадаліваў, узяў чарцяжы гэтай лазні і давай нешта крэмзаць. Адразу ж прапанову ўнёс. Навошта, кажа, нам дзяўбсці зямлю пад фундамент. Мы зробім па іншаму: мужчынскую лазню ўнізе, а жаночую — наверсе. Значыць што? — ён бліснуў вачыма, — палова фундаменту ф'юць, — і цыркнуў слінай на месца, дзе павінен быў быць гэты фундамент. Ну, а мне што, так дык так. Давайце, кажу, хутчэй за справу брацца, час ідзе, а ў мяне практыка гарыць. Пісулькін тут жа напісаў і ўтыркнуў у зямлю шыльду:

**«ЛАЗНЯ-79»**

Будавалі хутка. Вадаліваў насіўся як метэор: то цэмент недзе выбіваў, то цэглу, то бетонамяшалку ўночы прыцягнуў. Шпора амаль нічога на рабіў — быў пасыльным у магазін. Усё пляшкі насіў. «Праставу», так называемую. Дык тымі пляшкамі мы забілі палову фундаменту і ў сцены закладвалі.

— Усё акупіцца, — запэўніваў Вадаліваў, а Незалікін згаджаўся. Мы—таксама, бо думалі ўсё пра тую махорку.

Закончылі мы сцены, дах, але адна пляшка засталася. А Падказкін тут як тут: «Патрэбна, — кажа, — яе замест кветкі на дах прымацаваць, — і палез без лесвіцы чапляць. Не далез... Бразнуўся касціма на груды цэглы. Распрастаўся, вочы закаціў і выдыхнуў: «Лічыце, — кажа, — мяне студэнтам, калі што, да мазгоў маіх разбітых касцей буду верны вам». А Вадаліваў падбег і крычыць ва ўсё горла:

— ТэБэ не прытрымліваўся, папярэджваў жа мо!

— Дык як ён мог цябе прытрымлівацца, тым больш на другім паверсе, — уставіў туды Пісулькін і зграб Падказкіна ў ахапку. Спадабаўся ён мне тады, Пісулькін. Ён і выратаваў Падказкіна, аднёс у бальніцу.

На другі тыдзень выйшла замінка: лазню пабудавалі, а вось, як на другі паверх лазіць, нікому ў цям не прыйшло. Але Вадаліваў зноў «рацуху» кінуў.

— Мы, — кажа, — ліфт паставім тут. Не лесвіцу, а ліфт. Хай памятаюць нас. Спачатку адкрыем другі паверх — павага, значыць, да жанчын, а потым і першы. Мужчыны вытрымаюць, калі не памыюцца адзін, другі тыдзень. А цябе, — паглядзеў на мяне, — ліфцёрам уладкую, усё ж грошы будуць ісці.

Праз тры дні павесілі аб'яву аб адкрыцці жаночай лазні. А на чацвёрты—сабралася столькі жаночага полу, што і тры лазні не ўмясцілі б. Але я ўсіх адправіў наверх. Запусцілі, значыць, ваду, а самі тым часам завіхаемся на першым паверсе. Праз некаторы час чуем крыкі зверху. Я думаў усё, пачаў жанчын спускаць уніз і вачам сваім не веру — яны ўсе ажно ільдом пакрыліся... Вось тут ужо скеміў я першы: кацёл жа не пабудавалі, вады гарачай і не было. Я да Вадалівава, а той лыпае вачамі: «Памыліўся, — кажа, — патрэбна дзяўбсці падлогу і падвал рабіць пад кацельню».

Мясцовая ўлада прыйшла ў шаленства: «Грошы,—крычаць,—не выплацім, пакуль лазня не пройдзе выпрабаванне». Што яны і зрабілі... Я нават Вадаліваву не пажадаю мыцца ў той лазні. Ён зараз маўчыць, цягне мае пакункі, усё хоча, каб было шыта-крыта. Ужо падбухторвае на наступны год у другое месца ехаць. Туды не хоча, кажа, што архітэктар не павінен двойчы бачыць сваё збудаванне, яно можа рухнуць. Прыкмета, быццам такая ёсць. Але я думаю, што яно і без яго ўжо рухнула, збудаванне тое.

А зараз мы сядзім на вакзале. Да Мінска не хапіла грошай даехаць. Заканчваю пісаць, бо вунь ужо ідзе Вадаліваў. Напэўна зноў «рацуху» будзе кідаць. Так і ёсць... Цікава, вось толькі якую. Але аб гэтым—у другі раз.

Да пабачэння. Ваш ГОША ПАІНЬКІН».

● СПАТКАННЕ СА СВЕТАМ ЦУДОЎНАГА

# Змагацца творчасцю за чалавека

**Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння літоўскага савецкага паэта Эдуардаса Межэлайціса. Яго паэзія — знамянальная з'ява не толькі адной літоўскай культуры — усяго савецкага мастацтва. Увага да чалавека, да света яго душы, дэмакратычнасць — вось аснова яго творчасці.**

...Ён пачаў пісаць вершы, калі яму не было яшчэ і дзесяці гадоў. З дзяцінства і на ўсё жыццё ў яго творчасці застануцца два полюсы: пяшчотная душэўная ранімасць прыгажосцю навакольнага, цудам фантазіі, казак, легенд, якія чуў ля кастра плытагонаў і суровая, непадобная на казку, рэчаіснасць. І першыя радкі яго былі несвядомым пратэстам супраць таго, што хараство належыць адным, а галеча дана на долю іншых людзей.

«Я пел бы, верно, звонче, шире
Средь руты милой и родной,
Когда б все были сыты в мире
И общей счастливы судьбой».

Уся паэзія Эдуардаса Межэлайціса — гэта вяртанне хараства яе сапраўднаму гаспадару, працоўнаму чалавеку. Гэта ён сваімі рукамі і воляй робіць зямлю прыгожай, пакарае сабе прыроду.

«Подчинилась земля мне, и я
Одарил её красотой...
В шар земной упираясь ногами,
Солца шар я держу на руках.
Я—как мост меж землей и солнцем,
И по мне
Солнце сходит на землю,
А земля поднимается к солнцу»,—

піша паэт у кнізе «Чалавек».

Светлая, пяшчотная лірыка роднай прыроды, мілай сэрцу Літвы, да болю з дзяцінства знаёмых белагрывых бяроз змяняецца з часам у Межэлайціса філасофскай манументальнасцю, шырокім ахопам рэчаіснасці.

Зварот да музыкі, жывапісу, шчасліва супадаюць з дараваннем Межэлайціса, які тонка адчувае іншыя віды мастацтва. Гэта блізкасць яго музы Хараству асабліва ярка праяўляецца ў пастаяннай любві паэта да здзіўляючага, фенаменальнага багацця Мікалоюса Чурлёніса. Межэлайціс аналізуе яго карціны ў мастацказнаўчым эсэ, пераўтварае яго вобразы ў форме казак, асацыіруе з вобразамі мастака і кампазітара ўласныя вобразы ў шматлікіх вершах. Аб Чурлёнісе Межэлайціс напісаў і «чыстую» прозу — «Пісьмы з Друскінінкай».

Паэзія Межэлайціса — гэта сплаў філасофскага і рэалістычна-пластычнага адлюстравання сучаснага чалавека, датыкненне да хараства. Ляпіць чалавека будучыні — такі нялёгкі і слаўны ўдзел сапраўднага мастака, бо «...творы паэта патрэбны людзям да той пары, пакуль змагаецца ён у сваёй творчасці за чалавека. За яго будучыню, шчасце, лепшае і светлае



жыццё, за новыя эстэтычныя прынцыпы. Як толькі паэт перастае змагацца за ўсё гэта і пакідае поле бітвы, яму больш няма чаго сказаць».

Падрыхтавала С. ІВАНОВА.

Беларускі універсітэт

4 кастрычніка 1979 г.

Заказ № 1520. АТ 10860

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ